УДК 947.6 + 323.15(476)

*І.А. Пушкін*

# ПАРЛАМЕНЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ ПА РЭГУЛЯВАННІ МІЖНАЦЫЯНАЛЬНЫХ АДНОСІН

У дадзеным артыкуле ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі аналізуецца стварэнне і дзейнасць структур вышэйшага заканадаўчага органа Рэспублікі Беларусь па рэгуляванні міжнацыянальных адносін. Даследаваны і прааналізаваны працэс заканадаўчага забеспячэння правоў, нацыянальных супольнасцей. Зроблена выснова пра прыняцце рашэнняў парламенцкімі структурамі пасля ўсебаковага абмеркавання, з улікам агульнанацыянальных інтарэсаў, грамадска-палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў краіне.

## Уводзіны

Пасля атрымання незалежнасці ў Беларусі ўзнікла неабходнасць у рэарганізацыі існуючых і стварэнні новых структур органаў дзяржаўнай улады, у тым ліку ў сферы міжнацыянальных адносін. Мэта нашага даследавання – прааналізаваць дзейнасць вышэйшага органа ўлады Рэспублікі Беларусь – парламента (Вярхоўнага Савета, Нацыянальнага сходу) – па стварэнні прававых асноў удзелу нацыянальных супольнасцей у грамадскім і культурным жыцці Беларусі, а таксама рэгулявання міжнацыянальных адносін. Выкарыстоўваліся крыніцы з архіваў Рэспублікі Беларусь і Літоўскай Рэспублікі, апублікаваныя матэрыялы.

У беларускай навуцы гэта пытанне маладаследаванае. Некаторыя аспекты дзейнасці парламенцкіх структур у адпаведнай сферы толькі ўзгадваліся ў кантэксце дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі ў публікацыях Н. Бурай [1], Э. Іофе [2], А. Ліўшыца [3], А. Макрушыч [4], А. Осіпава [5], І. Пушкіна [6; 7]. Рэгуляваннем міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь займаліся прадстаўнічыя і выканаўчыя органы дзяржаўнай улады. Вопыт вырашэння міжнацыянальных праблем у судовым парадку ў краіне адсутнічае.

Спецыяльных дзяржаўных органаў у сістэме вышэйшай выканаўчай улады, якія займаліся праблемамі нацыянальных супольнасцей, у Беларусі да сярэдзіны 1990-х гг. не існавала, не было і механізмаў супрацоўніцтва ўладных структур і нацыянальных аб’яднанняў. Развіццём адукацыі на роднай мове займалася Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Падтрымку і фінансаванне іх культурных ініцыятыў ажыццяўляла Міністэрства культуры. Яно арганізацыйна і фінансава падтрымлівала правядзенне нацыянальных фестываляў, вылучала сродкі на арганізацыю конкурсаў, выстаў, утрыманне мастацкіх калектываў нацыянальных аб’яднанняў, мэтанакіравана займалася забеспячэннем спрыяльных умоў для развіцця мастацкай творчасці нацыянальных супольнасцей [8, арк. 11, 22; 9, арк. 30].

У мэтах эфектыўнага супрацоўніцтва дзяржаўных органаў кіравання з грамадскімі арганізацыямі нацыянальных супольнасцей і садзейнічання захаванню і развіццю іх культур у студзені 1995 г. была створана Каардынацыйная рада па справах нацыянальных меншасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (СМ РБ). Яе рашэнні насілі рэкамендацыйны характар. У студзені 1997 г. Указам Прэзідэнта «Аб сістэме рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, падпарадкаваных ураду Рэспублікі Беларусь» ствараецца Дзяржаўны камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей (1997–2001 гг.), з 2002 па 2006 гг. працуе Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей, з 2006 г. уводзіцца пасада ўпаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцей.

Міжнацыянальныя адносіны ў Беларусі сталі прадметам увагі прадстаўнічых органаў улады толькі з пачатку 1990-х гг. З 1972 г. да 21.09.1990 г. пытанні міжнацыя-

нальных адносін не знаходзілі адлюстравання ў працы якога-небудзь органа Вярхоўнага Савета (ВС) БССР. Іх разглядам павінен быў займацца аддзел па пытаннях сацыяльнага і культурнага развіцця, потым камісія па народнай асвеце і культуры. Не разглядаліся нацыянальныя праблемы і на сесіях ВС БССР да 2.02.1988 г. [10]. Толькі напрыканцы 1980-х гг., пасля падзей ва Узбекістане, Нагорным Карабаху, Абхазіі і іншых месцах, на міжнацыянальныя адносіны звярнулі ўвагу і ў Беларусі.

Пасля правядзення ў 1990 г. выбараў у мясцовыя і Вярхоўны саветы сталі адбывацца змены ў падыходах да вырашэння праблем міжнацыянальных адносін і задавальнення інтарэсаў нацыянальных супольнасцей Беларусі ў грамадска-палітычным і культурна-асветным жыцці. Пастановаю Прэзідыума ВС БССР ад 21.09.1990 г. у Сакратарыяце Вярхоўнага Савета ўнутры некаторых аддзелаў былі ўтвораны сектары. У складзе аддзела па пытаннях сацыяльнага і культурнага развіцця з'явіўся сектар па пытаннях адукацыі, культуры і міжнацыянальных адносін. Пастановаю ВС БССР XII склікання ад 1.06.1990 г. былі ўтвораны пастаянныя камісіі, сярод якіх – Камісія па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах (Камісія).

Пасля вырашэння арганізацыйных пытанняў на сваім чацвёртым пасяджэнні 24.09.1990 г. члены Камісіі – дэпутаты Вярхоўнага Савета – абмеркавалі зварот агульнага сходу аддзялення Польскага культурна-асветнага таварыства імя А. Міцкевіча (Гродна), які адбыўся 14.08.1990 г. Члены таварыства звярталіся да ўладаў з патрабаваннямі «спыніць антыпольскую кампанію ў газетах», атрымаць магчымасць сустрэчы з кіраўніцтвам Гродзенскай вобласці, прасілі выдзеліць памяшканне для таварыства, дапамагчы ў выданні газеты і стварэнні школ на польскай мове, даць дазвол на змяненне нацыянальнасці з беларускай на польскую і інш. Частка палякаў вобласці патрабавала «забараніць гвалтоўнае набажэнства ў касцёлах на беларускай мове», што, на нашу думку, ніяк не адпавядала добрым узаемаадносінам беларусаў і палякаў каталіцкага веравызнання і супярэчыла курсу каталіцкай царквы на ўжыванне падчас набажэнстваў нацыянальных моў краін знаходжання касцёла [7, с. 62].

4.12.1990 г. Камісія прыняла наступнае рашэнне па пытанні «Аб стане адраджэння нацыянальнай культуры і роднай мовы сярод грамадзян польскай нацыянальнасці ў Гродзенскай вобласці і іншых раёнах Беларусі»: рэкамендаваць СМ БССР разгледзець пытанне аб рэгістрацыі Саюза палякаў на Беларусі; вырашыць пытанне аб частковым фінансаванні газеты-органа СПБ; даручыць Гродзенскаму аблвыканкаму і гарвыканкаму разгледзець пытанні аб выдзяленні памяшканняў для СПБ, рэдакцыі газеты, частковым фінансаванні культурна-асветных аддзелаў таварыства; спрыяць хутчэйшаму развіццю польскай мовы; забяспечыць бібліятэкі літаратурай на польскай мове; выдзеліць памяшканні для гуртковай і іншай культурна-масавай дзейнасці; прыняць меры па аднаўленні помнікаў, якія ўшаноўваюць вядомых дзеячаў сумеснай гісторыі і культуры Беларусі і Польшчы [11, арк. 7–9, 48–49]. Аб задавальненні грамадска-палітычных і культурных патрэб асоб польскай нацыянальнасці размова таксама вялася на пасяджэнні Камісіі 22.05.1991 г., на якім было разгледжана пытанне «Аб ходзе выканання рашэння Камісіі па адраджэнні польскай культуры і мовы», узнятае Польскім культурна-асветным таварыствам імя А. Міцкевіча і 9.04.1992 г., калі была заслухана інфармацыя «Аб прапановах СПБ па пытаннях адраджэння польскай мовы і культуры» [12, арк. 125–127; 13, арк. 53]. Вясною 1991 г. члены Камісіі звярнулі ўвагу на сферу міжнацыянальных адносін. 20.03.1991 г. была заслухана інфармацыя вучоных Інстытута сацыялогіі АН БССР аб стане міжнацыянальных адносін у БССР, а 22.05.1991 г. разглядалася пытанне «Аб падрыхтоўцы праекта Закона «Аб свабодным развіцці нацыянальных і этнічных груп у БССР» [12, арк. 310–312, 125–127].

Напрыканцы 1980-х гадоў у Беларусі паўстала праблема нацыянальнага вывучэння Палескага рэгіёна. З'явіўся рух за прызнанне існавання заходнепалескай этнічнай

групы (етвязі). На пасяджэнні Камісіі 20.05.1991 г. абмяркоўвалася пытанне «Аб статуце і праграме грамадска-культурнага аб’яднання «Полісьсе». Статут быў прыняты на сходзе 14.04.1990 г. У ім дэкларавалася, што асноўная мэта аб’яднання – садзейнічанне этнакультурнаму адраджэнню Заходняга Палесся – Етвязі. Гэта частка Беларусі разглядалася як асобны край. У Статуце прасочваліся сепаратысцкія настроі. На пасяджэнні Камісіі частка дэпутатаў выказала заклапочанасць тым, што дзейнасць таварыства ініцыіруецца зверху, з боку выканаўчай улады, і гэта стварае нацыянальную напружанасць у рэспубліцы, вядзе да дэстабілізацыі міжнацыянальных адносін. 12.06.1991 г. Камісіяй разглядаўся «Зварот А. Трушко (А. Наварыча) з прапановаю больш актыўна садзейнічаць развіццю культуры Палескага рэгіёна Беларусі». Выступіў М.М. Шэлеговіч і расказаў аб працы грамадска-культурнага таварыства «Полісьсе». Ён прапанаваў: а) прыняць Закон аб заходнепалескай этнічнай групе народа, б) прыняць пастанову аб фінансаванні работы ГКТ «Полісьсе», в) стварыць заходнепалескі, культурна-асветны цэнтр. Дэпутаты прынялі рашэнне: «1) падтрымаць і адобрыць імкненне членаў ГКТ «Полісьсе» да вывучэння народнай культуры, фальклору, дыялекту Палескага рэгіёна... 3) лічыць немэтазгодным прыняцце заканадаўчых актаў па стварэнню якіх-небудзь аўтаномій, навуковых цэнтраў. Жыхары беларускага Палесся з’яўляюцца самабытнай часткай беларускага народа» [12, арк. 107–136].

2.10.1991 г. прадметам увагі Камісіі стала пытанне «Аб дзейнасці нацыянальных грамадска-культурных аб’яднанняў горада Мінска». На падставе таго, што ў маі 1991 г. пры Мінскім гарадскім аддзяленні Савецкага фонду міру былі зарэгістраваны і дзейнічалі 6 нацыянальных грамадска-культурных аб’яднанняў (татарскае, яўрэйскае, украінскае, рускае, армянскае, азербайджанскае) з агульнай колькасцю сяброў больш за 6 000 чалавек, а таксама рашэння 5-й нечарговай сесіі Мінскага гарадскога савета № 165 ад 5.09.91 г. аб размяшчэнні ў будынку Дома палітычнай асветы Мінскага абкама КПБ–КПСС Цэнтра нацыянальных культур, Камісія прыняла рашэнне: 1) прапанаваць Савету Міністраў разгледзець рашэнне Мінскага гарсавета аб утварэнні ў Доме палітасветы Цэнтра нацыянальных культур; 2) прапанаваць Дзяржкамдруку і Міністэрству культуры забяспечыць бібліятэкі літаратурай на мовах нацменшасцей; 3) прапанаваць Вярхоўнаму Савету ўвесці ў склад Камісіі па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах ВС РБ з правам дарадчага голасу прадстаўнікоў нацыянальных грамадска-культурных аб’яднанняў рэспублікі [12, арк. 139–147].

Пасля ўтварэння Рэспублікі Беларусь паўстала неабходнасць у стварэнні ўласнай заканадаўчай базы міжнацыянальных адносін. 16.12.1991 г. Камісіяй разглядаўся праект канцэпцыі Закона «Аб свабодным развіцці нацыянальных і этнічных груп у Рэспубліцы Беларусь». Пры падрыхтоўцы праекта члены Камісіі выкарыстоўвалі: закон СССР «Аб свабодным нацыянальным развіцці грамадзян СССР, якія пражываюць за межамі сваіх нацыянальна-дзяржаўных утварэнняў або не маюць іх на тэрыторыі СССР» (26.04.1990 г.), закон Украіны «Аб нацыянальных меншасцях на Украіне» (праект закона быў абмеркаваны 16.11.1991 г. у Адэсе на Усеўкраінскім з’ездзе нацыянальных меншасцей), закон аб нацыянальна-асабовай аўтаноміі на Украіне ад 24.01.1918 г., закон Літоўскай Рэспублікі «Аб нацыянальных меншасцях» ад 23.11.1989 г. (у рэдакцыі ад 11.03.1991 г.), закон Латвійскай Рэспублікі «Аб свабодным развіцці нацыянальных і этнічных груп Латвіі і іх праве на культурную аўтаномію» ад 19.03.1991 г., закон «Аб культурнай аўтаноміі нацыянальных меншасцей Эстоніі» ад 12.02.1925 г., парады АБСЕ, савета Еўропы [14, арк. 33–60].

Напрыканцы 1991 г. збіраліся заўвагі і прапановы камісій Вярхоўнага Савета, выканаўчых органаў улады, нацыянальных грамадскіх арганізацый да прапанаванага праекта Закона. Сам праект быў адобраны і прапанаваны 10.03.92 г. на разгляд 9-й сесіі ВС РБ у фармулёўцы «Аб свабодным развіцці нацыянальных груп (меншасцей) у Рэс-

публіцы Беларусь» [12, арк. 174–175]. Гэтая важная дзяржаўная справа не засталася па-за ўвагаю грамадскай дзейнасці сяброў нацыянальна-культурных таварыстваў. Яны актыўна імкнуліся паўплываць на працэс падрыхтоўкі і прыняцця Закона з улікам іх нацыянальных інтарэсаў, каштоўнасцей і запатрабаванняў. 8.04.1992 г. адбылася сустрэча кіраўнікоў нацыянальных аб’яднанняў з членамі Камісіі. У выніку на наступны дзень на яе пасяджэнні было вырашана прасіць сесію Вярхоўнага Савета задаволіць просьбу прадстаўнікоў грамадска-культурных аб’яднанняў азербайджанцаў, армян, татар, немцаў, рускіх, яўрэяў, украінцаў прысутнічаць на пасяджэнні сесіі пры абмеркаванні Закона і даць магчымасць выступіць [13, арк. 53].

Абмеркаванне і прыняцце праекта Закона «Аб свабодным развіцці нацыянальных груп у Рэспубліцы Беларусь» адбылося на сесіі ВС 23.04.1992 г. Ад імя каардынацыйнай рады нацыянальных аб’яднанняў Рэспублікі Беларусь на сесіі выступіў з прамоваю А.-Б. А. Шабановіч. Вярхоўны Савет адобрыў праект Закона ў першым чытанні. Распачаўся працэс дапрацоўкі праекта Закона. Паступіла шэраг заўваг і прапаноў ад камісій ВС (некаторыя камісіі наогул выступілі супраць прыняцця такога Закона), асобных дэпутатаў, ад грамадскіх арганізацый. Украінскае грамадска-культурнае аб’яднанне Брэсцкай вобласці патрабавала, каб у Законе быў прызнаны факт існавання і кампактнага пражывання на поўдні беларускага Палесся аўтахтоннага ўкраінскага насельніцтва. СПБ у праект Закона прапаноўваў унесці «права на ўтварэнне ў месцах кампактнага пражывання нацыянальных груп, якія складаюць большасць насельніцтва дадзенай мясцовасці, нацыянальных адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак», «права на вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты па асобных спісах нацыянальных супольнасцей». Падобнае прапаноўвала і аб’яднанне ўкраінцаў «Ватра» [15, арк. 12–14].

З ліпеня 1992 г. праект Закона ўжо рыхтаваўся пад назвай «Аб нацыянальных меншасцях». У другім чытанні праект Закона «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь» разглядаўся на Камісіі 24.08.92 г. і 19.10.92 г., быў адобраны і рэкамендаваны сесіі ВС. 11.11.1992 г. пастановаю Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь уведзены ў дзеянне Закон «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь» [16, арк. 1, 117]. У яго змест уносіліся змяненні і дапаўненні ў 2004, 2007 гг. [17].

24.08.1992 г. былі прыняты асноўныя напрамкі работы Камісіі па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах. У прыватнасці, у іх былі зафіксаваны: станаўленне беларускай дзяржавы, беларускае нацыянальнае адраджэнне, адраджэнне нацыянальнай свядомасці нацыянальных супольнасцей і г.д. 7.12.1992 г. на пасяджэнні Камісіі аналізавалася работа мясцовых саветаў народных дэпутатаў Гомельскай вобласці па ўдасканаленні міжнацыянальных адносін. Сярод іншага было зафіксавана існаванне насцярожаных адносін часткі рускага насельніцтва да палітыкі беларускага адраджэння [13, арк. 92–94, 160–165].

Дэпутаты – члены Камісіі 20.01.1993 г. – пазнаёміліся з інфармацыяй Э.К. Дарашэвіча аб выніках сацыялагічнага даследавання міжнацыянальных адносін беларускага памежжа на матэрыялах Заходняга Палесся (Маларыцкі, Іванаўскі, Кобрынскі, Пінскі раёны). Адзначалася, што 81,8% ад агульнай колькасці апытаных не выступалі за якуюнебудзь аўтаномію і лічылі сябе беларусамі. 61,7% лічылі немэтазгодным вылучэнне Заходняга Палесся ў самастойны культурна-моўны рэгіён у Рэспубліцы Беларусь, 7,3% падтрымалі ідэю аўтаноміі. Аўтары аналітычнай запіскі зрабілі выснову, што ў Беларусі «праблем асобнага палескага этнасу няма ў народнай этнічнай свядомасці». Было адзначана, што ў Заходнім Палессі насельніцтва гаворыць на рускай мове – 53,6%, беларускай – 12,6%, украінскай – 3,6%, польскай – 0,6%, на мясцовай мове (гаворцы) – 49,72%. На пытанне «Ці магчымы ў рэгіёне міжнацыянальныя канфлікты?» рэспандэнты адказалі: немагчымы – 45,8%, могуць быць нязначныя канфлікты – 33,2%, маецца глеба для сур’ёзных канфліктаў – 8,4%, не далі адказу – 12,6%. Апытванне засведчыла,

што ў Кобрынскім раёне адзначаецца супрацьстаянне праўкраінскіх палешукоў і тых, хто (аб'яднанне «Полісьсе») за самастойнасць Заходняга Палесся як адміністратыўна-моўнай і гаспадарча-эканамічнай адзінкі [18, арк. 10–12].

Апошняе пасяджэнне Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах прайшло 26.01.1993 г. У першай палове лютага 1993 г. адбылося яе перайменаванне. У сувязі з гэтым ужо Камісія Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па нацыянальнай палітыцы і пытаннях Садружнасці Незалежных Дзяржаў сабралася 24.02.1993 г., каб удакладніць асноўныя кірункі (канцэпцыю) работы [19, арк. 23].

8.12.1993 г. на пасяджэнні Камісіі разглядалася пытанне «Аб выкананні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь». На абмеркаванні вынікаў дзеяння Закона прысутнічалі прадстаўнікі органаў выканаўчай улады і прадстаўнікі нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў – рускай культуры «Русь», «Малдова», армян «Айястан», немцаў Беларусі «Адраджэнне», татар-мусульман «Аль-Кітаб», СПБ; асацыяцый карэйцаў, яўрэйскіх арганізацый Беларусі, украінцаў «Ватра». Неабходнасць гэтай сустрэчы была выклікана тым, што мінуў год, як быў прыняты Закон, і таму было варта абмеркаваць, як працуе Закон на месцах, падзяліцца вопытам, вызначыць праблемы, складанасці. Ад дэпутатаў, членаў камісіі, прадстаўнікоў нацыянальных грамадскіх аб'яднанняў прагучала шэраг заўваг і прапаноў: а) адсутнічала фінансавая падтрымка нацыянальных таварыстваў з боку дзяржавы, б) мясцовыя ўлады не дазвалялі нацыянальным грамадскім аб'яднанням займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю, в) артыкул 5 Закона меў дэкларатыўны характар, г) у м. Свір Мядзельскага раёна мясцовыя ўлады не далі дазвол на правядзенне сходу СПБ, перашкаджалі адкрыццю польскамоўных класаў у г. Лідзе, д) камісія ВС па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны займалася толькі адраджэннем беларускай мовы і культуры і не дапамагала іншым нацыянальным супольнасцям, е) былі патрэбны падатковыя ільготы, ж) пры Савеце Міністраў патрэбна стварыць фонд дапамогі нацыянальным супольнасцям, з) стварыць у цэнтры г. Мінска цэнтр нацыянальных культур, і) у раёнах было складана атрымаць памяшканне для дзейнасці аб'яднанняў.

Члены Камісіі адзначылі, што некаторыя грамадскія аб'яднанні сталі займацца палітычнай дзейнасцю, у прыватнасці, па ініцыятыве СПБ у Гродне адбыўся з'езд ветэранаў Арміі Краёвай, чыя дзейнасць у беларускай гісторыі ацэньваецца неадназначна. У адказ з боку прадстаўнікоў украінскага і татарскага аб'яднанняў прагучала: «Калі мы падпісваем нешта са згоды ўладаў – гэта добра, а калі падпісваем нешта іншае – гэта палітыка і парушэнне статута».

У выніку было адзначана, што адбылося плённае абмеркаванне праблем нацыянальных супольнасцей. Ніякіх канкрэтных рашэнняў Камісіяй не было прынята, толькі запланавалі правядзенне ў канцы снежня пасяджэння Камісіі з удзелам прадстаўнікоў выканаўчай улады (Савета Міністраў, міністэрстваў адукацыі, культуры, інфармацыі, савета па справах рэлігіі), на якім збіраліся абмеркаваць практычныя пытанні рэалізацыі Закона «Аб нацыянальных меншасцях» [19, арк. 106–111].

15.03.1994 г. у Рэспубліцы Беларусь была прынята Канстытуцыя. Дэпутаты парламенцкіх камісій, якія адказвалі за сферу міжнацыянальных адносін, спрычыніліся да яе распрацоўкі і ўнясення змен. Пасля рэферэндуму 1996 г. у Канстытуцыі тэрмін нацыянальныя меншасці быў заменены на нацыянальныя супольнасці [20].

17.03.1994 г. на пасяджэнні Камісіі было заслухана пытанне «Аб будаўніцтве Літоўскага культурна-асветніцкага цэнтра ў в. Рымдзюны Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці». Будаўніцтва цэнтра было задумана яшчэ ў 1990 г. З 18.09.1990 г. распачалося будаўніцтва. Да пачатку 1994 г. узнік канфлікт паміж мясцовымі ўладамі і Літоўскай Рэспублікай наконт завяршэння будаўніцтва (крыніц фінансавання) і таго,

хто будзе гаспадаром цэнтра. Гродзенскі аблвыканкам нават прыняў рашэнне аб спыненні будаўнічых прац. Камісія, заслухаўшы экспертаў і абмеркаваўшы дакументы, вырашыла, што неабходна правесці перамовы з літоўскім бокам, завяршыць будаўніцтва і пасля гэтага вызначыць уладальнікаў цэнтра. Яго ўрачыстае адкрыццё адбылося 18.03.2001 г. [21, арк. 17–18].

Пасля правядзення ў Рэспубліцы Беларусь выбараў Прэзідэнта сталі адбывацца змены ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Закранулі яны і дзейнасць вышэйшага заканадаўчага органа ўлады.

Пастановаю ВС Рэспублікі Беларусь XIII склікання ад 16.01.1996 г. была ўтворана Камісія па правах чалавека, нацыянальных пытаннях, СМІ, сувязях з грамадскімі аб'яднаннямі і рэлігійнымі арганізацыямі. За ўвесь час свайго існавання і дзейнасці (23.01.1996 г.–12.10.1996 г.) яна толькі аднойчы, 30.05.1996 г., звярнула сваю ўвагу на нацыянальнае пытанне ў Беларусі. Дэпутатаў пазнаёмілі з прапановамі інстытута «Белінфармпрагноз» правесці для ВС сацыялагічныя даследаванні на тэму «Заканадаўчыя асновы рэгулявання міжнацыянальных і рэлігійных адносін у Рэспубліцы Беларусь». Было вырашана правесці гэтыя даследаванні [22, арк. 49].

Пасля правядзення ў 1996 г. рэферэндуму адбылося змяненне назвы, паўнамоцтваў і структуры вышэйшага заканадаўчага органа краіны. У Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь была створана Пастаянная камісія па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі. У Савеце Рэспублікі міжнацыянальныя адносіны ўваходзяць у круг пытанняў Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.

Парламенцкія камісіі Рэспублікі Беларусь, якія адказвалі за нацыянальнае пытанне, у розны час сваёй дзейнасці прымалі ўдзел у падрыхтоўцы і распрацоўцы праектаў законаў «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь» (прыняты ў 1991 г.), «Аб мовах» (1990 г., змяненні і дапаўненні 1998 г.), «Аб культуры» (1991 г., 2001 г.), «Аб адукацыі» (1991 г.), «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» (1992 г., 2006 г.), «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь» (1993 г., 2005 г.), «Аб грамадскіх аб'яднаннях» (1994 г., 2004 г.), «Аб бежанцах» (1995 г., 1999 г.), «Аб дзяржаўнай службе» (2003 г.), «Аб супрацьдзеянні экстрэмізму» (2007 г.), у якіх адлюстраваны пэўныя аспекты рэгулявання міжнацыянальных адносін [5, с. 189–190; 6, с. 71–76; 7, с. 10–21].

**Заключэнне**

Такім чынам, вышэйшы заканадаўчы орган Рэспублікі Беларусь з першых дзён свайго стварэння забяспечыў падтрымку ініцыятыў і працэсу супрацоўніцтва з нацыянальнымі грамадскімі аб'яднаннямі для захавання ў беларускім грамадстве стабільнасці і дыялогу паміж прадстаўнікамі розных нацыянальных супольнасцей і ўладамі. Да моманту стварэння ў сярэдзіне 1990-х гг. органаў выканаўчай улады, адказных за правядзенне нацыянальна-канфесійнай палітыкі, парламенцкія структуры выконвалі асноўную ролю па рэгуляванні міжнацыянальных адносін.

З чэрвеня 1990 г. у структуры заканадаўчай улады Беларусі былі ўтвораны пастаянныя камісіі, сярод якіх – Камісія па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах, з лютага 1993 г. – Камісія па нацыянальнай палітыцы і пытаннях СНД, са студзеня 1996 г. – Камісія па правах чалавека, нацыянальных пытаннях, СМІ, сувязях з грамадскімі аб'яднаннямі і рэлігійнымі арганізацыямі. Сёння профільнай структурай у Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь з'яўляецца Пастаянная камісія па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, у Савеце Рэспублікі міжнацыянальныя адносіны з'яўляюцца прадметам разгляду Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці.

Аналіз крыніц дазваляе сцвярджаць, што дэпутаты імкнуліся ўважліва і ўсебакова разглядаць прапановы і ініцыятывы грамадзян і нацыянальных арганізацый, праекты законаў. Яны прымалі рашэнні ўзважана, з улікам дзяржаўных інтарэсаў, а таксама грамадска-палітычнай і эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы. У пэўныя перыяды сваёй дзейнасці парламенцкія камісіі недастаткова займаліся праблемамі нацыянальных супольнасцей. Тым не менш у выніку іх дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь створана неабходная заканадаўчая база для развіцця нацыянальных супольнасцей і забеспячэння іх належнага статусу. У выніку правядзення дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі, якая забяспечвала задавальненне культурна-асветных і грамадскіх запатрабаванняў нацыянальных супольнасцей з улікам агульнанацыянальных інтарэсаў краіны, у беларускім грамадстве склаліся стабільныя міжнацыянальныя адносіны.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Бурая, Н.В. Уплыў дзяржаўнай палітыкі на развіццё нацыянальны і канфесіянальных адносін у Беларусі (1992–2004 гг.) / Н.В. Бурая // Весці БДПУ. Сер. 2. – 2007. – № 1. – С. 46–49.

2. Иоффе, Э.Г. Проблемы реализации прав национальных общностей и законодательство Республики Беларусь / Э.Г. Иоффе // Чалавек. Грамадства. Свет. – 2005. – № 1. – С. 58–62.

3. Лившиц, А. Развитие белорусского законодательства против антисемитизма, расовой и национальной вражды или дискриминации / А. Лившиц // Беларусь у ХХ стагоддзі. Вып. 1. – Мінск : Водолей, 2002. – Вып. 1. – С. 110–114.

4. Макрушич, Е.Н. Этнокультурная политика в отношении национальных меньшинств в Республике Беларусь (1995–1998 гг.) / Е.Н. Макрушич // Весн. Гродзен. дзярж. ун-та імя Я. Купалы. Сер. 1. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. – 2008. – № 1. – С. 49–55.

5. Осипов, А. Этнокультурная политика в Беларуси: сопоставление с международным контекстом / А. Осипов // Вопросы меньшинств в Республике Беларусь, Европе и мире / сост., авт. предисл. А. Осипов, А. Василевич. – Минск : Медисонт, 2012. – С. 171–198.

6. Пушкін, І.А. Заканадаўчыя асновы міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь (1991–2010 гг.) / І.А. Пушкін // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. 1. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. – 2012. – № 1. – С. 70–79.

7. Пушкін, І.А. Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.) : манаграфія / І.А. Пушкін. – Магілёў : МДУ імя А. Куляшова, 2007. – 206 с.

8. Дакументы аб супрацоўніцтве Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь з культурнымі аб'яднаннямі нацыянальных меншасцей // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 33.

9. Звесткі аб творчай дзейнасці нацыянальных культурна-асветных аб'яднанняў у Рэспубліцы Беларусь. 2004 г. // НАРБ. – Фонд 974. – Воп. 4. – Спр. 474.

10. Сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР : стэнаграфічныя справаздачы. – Мінск : Беларусь, 1972–1989.

11. Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 4089.

12. Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 4090.

13. Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 4091.

14. Матэрыялы да пасяджэння камісіі // НАРБ. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 4094.

15. Матэрыялы да пасяджэння камісіі // НАРБ. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 4095.

16. Пастанова Вярхоўнага Савета // НАРБ. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 4095.

17. О национальных меньшинствах в Республике Беларусь : Закон Респ. Бела-

русь, 11 нояб. 1992 г., № 1926–XII : изм. и доп : Закон от 5 янв. 2004 г. № 261–З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2004. – № 4. – 2/1010.

18. Аналітычная запіска аб выніках сацыялагічнага даследавання // НАРБ. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 4092.

19. Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 4092.

20. Конституция Республики Беларусь 1994 г. : с изменениями и дополнениями, принятыми на республиканских референдумах 24 ноября 1996 г. и 17 октября 2004 г. – 3-е изд. – Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2008. – 64 с.

21. Праграма адкрыцця літоўскага культурнага цэнтра ў Рымдзюнах // Літоўскі дзяржаўны новы архіў у г. Вільнюсе. – Фонд 78. – Воп. 1. – Спр. 163.

22. Пратакол пасяджэння камісіі // НАРБ. – Фонд 968. – Воп. 1. – Спр. 4669.

***Pushkin I.A.*** **Parliamentary Activities on Settlement of Interethnic Relations in the Republic of Belarus**

For the first time in Belarusian historiography establishment and activities of supreme legislative body organizations on settlement of interethnic relations in the Republic of Belarus is analyzed. Procedure for legislative security of national minorities’ rights is studied and analyzed. A conclusion has been drawn about parliamentary structures making decisions after comprehensive discussion with due regards for nationwide interests, existing political and economic circumstances in the country.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 24.01.2013